# СУСТРЭЧА
# З ПІСЬМЕННІКАМ — ЗЕМЛЯКОМ

Аб маючай адбыцца сустрэчы з пісьменнікам-земляком Аляксеем Мікалаевічам Кулакоўскім у клубе будаўнікоў салігорцы ведалі загадзя. Работнікі гарадской бібліятэкі (загадчыца Садоўнікава О. І.), якія арганізоўвалі гэтую сустрэчу, многім чытачам паслалі запрашальныя пісьмы, развесілі ў горадзе аб'явы. І вось клуб перапоўнены.

Адкрываючы сустрэчу, выкладчык горнахімічнага тэхнікума імя Марыса Тарэза Валерый Сцяпанавіч Корзун дае слова госцю. Прысутныя горача вітаюць яго. Аляксей Мікалаевіч ужо не першы раз прыязджае да сваіх землякоў. Ён быў тут і ў той дзень, калі закладваўся першы камень новага гарняцкага горада, калі ў першы пабудаваны дом сяліліся навасёлы і калі выдалі першыя тоны сільвініту нагара.

Многа напісаў Аляксей Мікалаевіч за сваё жыццё. Яго творчасць пачалася яшчэ ў даваенныя гады. Асабліва яна паўзраслела, стала больш спелай у пасляваенныя гады. Аляксей Мікалаевіч з першых да апошніх дзён Айчыннай вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў на фронце, камандаваў дзеючымі падраздзяленнямі, працаваў у франтавым друку. І ўпаўне зразумела, што першыя пасляваенныя яго творы былі прысвечаны ваеннай тэматыцы, гераізму савецкага народа, яго праслаўленых воінаў і партызанаў. Аляксей Мікалаевіч падрабязна расказвае, як ён працаваў над гэтымі творамі, прачытаў свае апошнія кароткія гумарэскі.

Затым пісьменнік расказаў аб сваёй рабоце над творамі аб Салігорску, аб яго выдатных людзях, падзяліўся планамі на б у д у ч а е. З цеплынёю аб творчасці земляка-пісьменніка гаварылі ў сваіх выступленнях намеснік дырэктара другой сярэдняй школы Фёдар Мікалаевіч Молчан, дырэктар Дома піянераў Валянціна Аляксандраўна Кірыленка, дыспетчар 122-га ўпраўлення Генадзь Сямёнавіч Піройжнік і іншыя.

У заключэнне пачынаючыя паэты і празаікі Салігорска прачыталі свае творы.

**П. ПАЎЛЮКОЎ.**